NEWSLETTER

24.04.2009 — 30.04.2009

BELARUS Live

www.Belarus-Live.eu

## Шаноўнае спадарства!

**З 1 траўня 2009 г. часова перапыняецца выпуск штотыднёвага аналітычнага бюлетэня “Belarus-Live” у сувязі са зьменай рэдакцыйнай палітыкі.**

***З павагай,***
***Рэдакцыя “Belarus-Live”***

Забаронены ўвоз жывёльнай прадукцыі з Мэксыкі і ЗША

Леанід Злотнікаў: «Беларусь можа зусім ня выйсьці з крызысу»

Два тыдні працягваецца галадоўка за кратамі Мікалая Аўтуховіча

Ватыкан не камэнтуе ініцыятыву Лукашэнкі

Гвалтоўна забраны ў войска Зьміцер Хведарук праходзіць паўторнае мэдабсьледаваньне

Гарадзенскаму тэатру Тызэнгаўза 240 гадоў



Мінулы тыдзень прайшоў для беларускіх ды многіх іншых СМІ пад знакам сустрэчаў Лукашэнкі з Папам Рымскім у Ватыкане і прэм’ерам Бэрлюсконі падчас нефармальнай вячэры. Прыезд Лукашэнкі ў Італію стаў нагодай для канстатацыі, што 14-гадовая замежнапалітычная самаізаляцыя для беларускага рэжыму скончылася. Аднак у дачыненьні да Беларусі ящчэ працягваюць дзейнічаць рознага кшталту эканамічныя санкцыі Эўразьвязу і ЗША, прынятыя ў свой час паводле палітычных матываў. Як адзначаюць незалежныя экспэрты, дзеля дыялёгу з афіцыйным Менскам, які працягваецца ўжо больш за паўгоду, у Брусэлі палічылі за лепшае «згубіць» ня толькі 12 вядомых умоваў Эўразьвязу для нармалізацыі дачыненьняў зь Беларусьсю, але і ня ўзгадваць нават 5 пазасталых, якія, як уяўлялася, Менск можа выканаць хутчэй. Рэжым Лукашэнкі здолеў навязаць Эўразьвязу свой тэмп нармалізацыі дачыненьняў, пры гэтым фактычна нічога не мяняючы ў сваёй унутранай антыдэмакратычнай, рэпрэсіўнай палітыцы, якую ящчэ ня так даўна ў аб’яднанай Эўропе лічылі непрымальнай. Многія праціўнікі рэжыму Лукашэнкі лічаць, што пасьля сустрэчы з Папам Рымскім дыктатар атрымаў індульгенцыю для працягненьня свайго палітычнага жыцьця. Пра патэнцыйныя рызыкі палітыкі « прымірэньня» ў дачыненьні да «апошняга дыктатара Эўропы» задумваюцца далёка не ва ўсіх сталіцах краінаў Эўразьвязу. У многім такая цярпімасьць да Лукашэнкі сёньня выкліканая страхам Эўропы перад агрэсіўнай Расеяй, які ўзмацніўся пасьля яе вайны з Грузіяй. Праўда, падчас сустрэчы ў Варшаве з дэлегацыяй

беларускай апазыцыі кіраўнік МЗС Польшчы прызнаў наяўнасьць рызыкі ў цяперашняй палітыцы Лукашэнкі, але выказаў спадзеў, што патэнцыял цяперашняга дыялёгу з рэжымам пакуль поўнасьцю ня вычарпаны.

Што тычыцца самога кіраўніка Беларусі, то пасьля сваіх сустрэчаў з Папам Рымскім і прэм'ерам Бэрлюсконі ён яшчэ больш паверыў у свае патэнцыял і гістарычныя пэрспэктывы. Пакуль ідуць рознага кшталту размовы  і гаданьні з нагоды прыезду ці адсутнасьці Лукашэнкі на Праскім саміце ЭЗ і краінаў-удзельніцаў польска-швэдзкай ініцыятывы «Ўсходняе партнэрства» 7 траўня, стала вядома, што, папярэдне, 6 траўня ў Гомелі павінен адбыцца беларуска-ўкраінскі саміт з удзелам прэзыдэнтаў Лукашэнкі і Юшчанкі. Тэма — «Усходняе партнэрства». То бок у Гомелі будзе зробленая спроба кансалідаваць пазыцыі Менску і Кіева напярэдадні прэзэнтацыі ініцыятывы «Ўсходняе партнэрства» ў Празе.

На тле дыялёгу ў эўрапейскім кантэксьце, які ідзе паміж Менскам і Брусэлем, сталі адбывацца падзеі, якія могуць сур'ёзна гэты дыялёг падарваць.

Гаворка вядзецца пра дачыненьні з суседзямі-краінамі Эўразьвязу.

Прэсавы сакратар МЗС Латвіі Івар Ласіс заявіў, што ў Рызе «ацэняць магчымыя наступствы павелічэньня тарыфаў на імпартаваныя тавары і падрыхтуюцца да адпаведных дзеяньняў». «Латвія як суседка Беларусі вельмі занепакоеная рашэньнем пра павелічэньне тарыфаў. Увядзеньне мераў пратэкцыянізму, асабліва для Латвіі, памежнай дзяржавы, стварае пагрозу больш працяглага выйсьця з крызысу», – адзначыў ён.

Паводле словаў прэсавага сакратара, крызыс можна пераадолець толькі разам і пакідаючы рынкі адкрытымі. «У адказ на дзеяньні Беларусі МЗС Латвіі гатовы заняць цьвёрдую пазыцыю. Зараз адказныя латвійскія інстанцыі ацэньваюць уплыў прынятага Беларусьсю рашэньня на лёс латвійскіх прадпрыемстваў», – адзначыў Івар Ласіс.

23 красавіка Аляксандар Лукашэнка выдаў указ пра павышэньне мыта на шэраг імпартаваных тавараў. У залежнасьці ад віду тавару мыта павялічваецца ад 25% да 40%.

Паводле некаторых дадзеных, аналягічная сытуацыя складаецца і зь Летувой. А вось з Польшчай узьнікла сур'ёзная сытуацыя ў іншай галіне.

24 красавіка на пераходзе Брузгі беларускія мытнікі затрымалі аўтамабіль супрацоўнікаў польскага МЗС, якія па службовых справах ехалі ў Беларусь. Дыпляматы мелі намер наведаць консульства ў Гародні і амбасаду ў Менску.

На пэратрус дыпляматы не пагадзіліся. Перамовы з мытняй доўжыліся 12 гадзінаў. Нягледзячы на пратэст палякаў, беларуская мытня ўсё ж канфіскавала дыпляматычную пошту, а саміх дыпляматаў вярнулі назад у Польшчу, пра гэта паведаміла «Газета выборча».

МЗС Польшчы расьсьледуе інцыдэнт, аднак ня мае намеру пра яго шырока апавяшчаць.

А гаворачы пра сытуацыю ў беларускай эканоміцы, незалежныя экспэрты адзначаюць, што, у выпадку здольнасьці прафінансаваць аптымістычны дэфіцыт у поўным аб'ёме ў 2009 г. і ў 2010 г. гэтак жа, варта ўлічваць нюансы: у 2011 г. і 2012 г. на сытуацыю з дэфіцытам накладаецца неабходнасьць вяртаньня крэдытаў МВФ. Трэба будзе пагашаць больш за 1 млрд даляраў у год.

Экспэрты мяркуюць, што без дэвальвацыі прафінансаваць дэфіцыт бягучага рахунку наўрад ці ўдасца. Асноўныя выдаткі ў тым, што дэвальвацыя разганяе інфляцыю. Нават узмацненьне жорсткасьці манетарнай палітыкі не ратуе ад інфляцыі – хіба што сусьветная эканоміка пачне бурна расьці, пачынаючы з 2010 г., і мы зможам істотна павялічыць экспарт і пад гэта прыцягваць кароткатэрміновае фінансаваньне.

Паводле розных ацэнак экспэртаў, у сёньняшніх умовах дэвальвацыя не зьяўляецца фактарам росту экспарту, але затое дазваляе скараціць імпарт. Сёньня экспарт «памірае» нашмат хутчэй, чым імпарт, што стварае дадатковы ціск на валютны рынак. За студзень-люты 2009 г. кошт экспарту


photo.bymedia.net

зьнізіўся на 47,8% у параўнаньні з аналягічным пэрыядам 2008 г., кошт імпарту – на 32,1%.




Між тым Нацыянальны банк Беларусі, паводле словаў яго кіраўніка Пятра Пракаповіча, намераны ў другім квартале 2009 г. утрымліваць хістаньні курсу беларускага рубля да кошыка замежных валютаў у межах плюс-мінус 1%. Гэта азначае, што курс беларускага рубля да даляра ў другім квартале можа скласьці ад Br2630 да Br3053 за USD1.

АФІЦЫЙНА

## Забаронены ўвоз жывёльнай прадукцыі з Мэксыкі і ЗША




***Беларускія ўлады часова ўвялі забарону на ўвоз жывёлагадоўчай прадукцыі з Мэксыкі, ЗША, Канады, Новай Зэляндыі, Гішпаніі, Францыі і Ізраілю. Пералік можа пашырацца.***

Пра гэта паведаміла прэсавая сакратарка Міністэрства сельскай гаспадаркі Беларусі Дар'я Казлоўская.

Забарона датычыцца краінаў, у якіх выяўленыя выпадкі сьвінога грыпу. Заплянаванае тэрміновае паседжаньне ўсіх кіраўнікоў вэтэрынарных службаў Беларусі. На ўсіх жывёлагадоўчых прадпрыемствах краіны ўзмоцненыя захады біябясьпекі.

*Інтэрфакс*

ЭКАНОМІКА

## Леанід Злотнікаў: «Беларусь можа зусім ня выйсьці з крызысу»

***Заяву Лукашэнкі пра тое, што Беларусь першай выйдзе з эканамічнага крызысу і зможа заняць таварныя нішы іншых дзяржаў, пракамэнтаваў незалежны эканаміст Леанід Злотнікаў: «Адназначна, што Беларусь зусім ня выйдзе з крызысу, калі будзе працягвацца тая ж эканамічная палітыка, як ёсьць сёньня. Выйдуць з крызысу тыя краіны, якія вельмі моцна канкурэнтаздольныя сваёй прадукцыяй, якія мадэрнізуюць сваю вытворчасьць, кіраваньне. У Беларусі ўсё гэта архаічнае. І сыстэма кіраваньня, і прадпрыемствы ў нас засталіся з часоў СССР».***

«Эканамічная лібэралізацыя, якой у штогадовым пасланьні хваліўся А. Лукашэнка, яшчэ не закранула галоўных аспэктаў – свабоды цэнаўтварэньня і абароны прыватнай уласнасьці», – мяркуе Л. Злотнікаў.

Нагадаем, што 23 красавіка беларускі кіраўнік зрабіў шэраг заяваў падчас свайго штогадовага звароту да народу і парлямэнту.

У прыватнасьці, ён заклікаў беларусаў «працаваць суткамі, ня спаць і ня есьці, але захаваць вытворчасьць». Аляксандар Лукашэнка назваў злачыннымі стратны экспарт і працу «на склад», а таксама заявіў, што зьбіраецца «спыняць любыя настроі «хачу – працую, хачу – не».

*Радыё Свабода*

ГРАМАДЗТВА

## Два тыдні працягваецца галадоўка за кратамі Мікалая Аўтуховіча




***16 красавіка ваўкавыскі прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч***

***абвесьціў галадоўку ў менскім сьледчым ізалятары. Ён патрабуе перадаць справу ў суд або зьмяніць меру стрыманьня яму і яго калегам Юрыю Лявонаву і Уладзімеру Асіпенку. Нагадаем, іх арыштавалі 8 лютага ў Ваўкавыску і даставілі ў турму на Акрэсьціна ў сталіцы, іх падазраюць, у прыватнасьці, у падпале маёмасьці чыноўнікаў у райцэнтры.***

Былы палітвязень Валеры Леванеўскі, наколькі магчыма, сочыць за лёсам ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча.

Леванеўскі: «Я думаю, што галадоўка ў турме – сам па сабе крок мужны. А ўлічваючы, што ў яго стан здароўя, наколькі мне вядома, складаны, я думаю, што гэта крок адчаю, бо ён нават не разумее – за што сядзіць. Хаця, з майго пункту гледжаньня, яго проста ўзялі для пастраху іншым, для запалохваньня насельніцтва, каб не было пратэстных настрояў».




Валеры Леванеўскі мяркуе, што без шырокай грамадзкай падтрымкі галадоўніку Аўтуховічу будзе вельмі складана. Але, на жаль, палітычныя дзеячы апазыцыі не агучваюць шырока, што чалавек проста сядзіць нізавошта, кажа Валеры Леванеўскі.

Грамадзкі праваабаронца з Горадні Сяргей Мальчык зазначае: «Я ня думаю, што ў цяперашніх палітычных умовах Аўтуховіч прыняў правільнае рашэньне ісьці на крайнюю меру, таму што пры цяперашнім стане сродкаў масавай інфармацыі, пры эканамічным становішчы ў краіне, пры адносінах Эўразьвязу да цяперашняга рэжыму, я ня думаю, што яна будзе мець дастаткова вялікі розгалас, каб Аўтуховіч змог дамагчыся таго, чаго ён дамагаецца сваёй галадоўкай, гэта – справядлівасьці і законнасьці ў дачыненьні да яго».

Варта зазначыць, што і Сяргей Мальчык, і Валеры Леванеўскі ведаюць пра галадоўку не з чужых словаў, яны раней неаднаразова галадалі самі на знак пратэсту, калі апынаrange пад арыштам за кратамі.

Паводле адваката Паўла Сапелкі, стан галадоўніка Мікалая Аўтуховіча пагоршыўся, ён знаходзіцца ў мэдчастцы сьледчага ізалятару.

*Радыё Свабода*

ПАЛІТЫКА

## Ватыкан не камэнтуе ініцыятыву Лукашэнкі

***Ватыкан пакуль афіцыйна не адрэагаваў на словы Аляксандра Лукашэнкі адносна магчымасьці хуткай сустрэчы Патрыярха Маскоўскага і Папы Рымскага ў Беларусі.***

Паводле крыніцы з Ватыкану, такія сустрэчы рыхтуюцца на вышэйшым царкоўным узроўні.







Прадстаўнік Ватыкану на ўмовах ананімнасьці таксама зазначыў, што, калі б такая сустрэча Папы і Патрыярха адбылася, то хутчэй у Рыме ці Маскве.

Тым часам прадстаўніцтва Расейскай Праваслаўнай Царквы заяву беларускага кіраўніка пра «хуткую сустрэчу ў Менску» пракамэнтавала стрымана, падкрэсьліўшы, што такая падзея «не павінна вызначацца неадкладнай палітычнай кан'юнктурай».

*Радыё Свабода*

АПАЗЫЦЫЯ

## Гвалтоўна забраны ў войска Зьміцер Хведарук праходзіць паўторнае мэдабсьледаваньне

***Моладзевы актывіст Зьміцер Хведарук другі раз за тры месяцы патрапіў у шпіталь. Зараз ён знаходзіцца ў Вайсковым шпіталі Менску, куды яго прывезьлі на мэдычнае абсьледаваньне.***



photo.bymedia.net

У апошні раз актывіст «Маладога фронту» знаходзіўся ў шпіталі ў Барысаве, лекары якога накіравалі Хведарука на паўторную мэдкамісію ў Менск. Па ейных выніках моладзевага лідэра могуць камісаваць з войска па стане здароўя.

«Хведарук адчувае сябе нядрэнна, – кажа моладзевы актывіст Мікалай Дземідзенка. – Аднак у яго практычна ўвесь час баліць галава».

Нагадаем, што 28 студзеня 2009 году Зьмітра Хведарука гвалтам завезьлі ў ваенкамат, а пасьля ў турму на вуліцы Акрэсьціна, нібыта для адбываньня пакараньня за ўдзел у леташняй акцыі 1 траўня. Пазьней стала вядома, што такой пастановы суду не было. Тым ня менш Хведарука 2 дні пратрымалі ў турме. Адтуль яго ў кайданках вазілі на мэдычны агляд у менскую паліклініку №14. У кайданках актывіста «Маладога фронту» адвезьлі ў вайсковую частку ў Жодзіна. Зьміцер Хведарук паведамляў раней, што падчас мэдычнага агляду ў яго не было пры сабе ні мэдычнай карткі, ні выпіскі хваробаў, ні нават дакумэнту, які сьведчыць асобу.

*Хартыя'97*

КУЛЬТУРА

## Гарадзенскаму тэатру Тызэнгаўза 240 гадоў

***Ён быў створаны 30 красавіка 1769 году. Сёньня тут дзейнічае абласны тэатар лялек.***

Тэатар Тызэнгаўза пачынаўся зь невялікага ансамблю інструмэнтаў і вакалістаў, амаль праз дзясятак гадоў дасягнуў высокага прафэсійнага ўзроўню і стаў шматпрофільны. У пастаноўках сталі актыўна ўдзельнічаць гадаванцы ўласнай тэатральнай школы, якіх набіралі пераважна з прыгонных сялянаў. На сцэнах тэатру ставіліся опэра А. Грэпэры «Магніфік», камэдыя П. Бамаршэ «Сэвільскі цырульнік», тут жа адбылася прэм'ера «Лятарэі» С. Манюшкі. Калі ж гарадзенскага старасту Антонія Тызэнгаўза пазбавілі ўсіх пасадаў, балетная трупа і тэатральная школа працягнулі працу ў Паставах.

Будынак тэатру зьяўляецца помнікам архітэктуры XVIII ст., ён уваходзіць у архітэктурны ансамбаль Гарадніцы. Быў закладзены ў 1772 г. архітэктарамі Ёганам Георгам Мёзэрам і Джузэпэ дэ Сака.

У 1980 годзе рашэньнем аблвыканкаму быў створаны Гарадзенскі абласны тэатар лялек, які і разьмясьціўся ў старым будынку ў парку Жылібэра.

*Наша Ніва*

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

Асацыяцыя журналістаў Беларуская

EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

польская дапамога

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap. The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.